РАШЭННЕ БАБРУЙСКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА
21 студзеня 2019 г. № 2-5

# Аб унясенні змяненняў у рашэнне Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 19 студзеня 2011 г. № 3-24

На падставе пункта 1 артыкула 40 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Пункты 5–7 Інструкцыі аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітета імя М.Лынькова, зацверджанай рашэннем Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 19 студзеня 2011 г. № 3-24 «Аб заснаванні спецыяльнай прэміі Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта імя М.Лынькова» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 21, 9/38340; Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 30.04.2016, 9/76237), выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Для разгляду дакументаў ствараецца гарадская камісія ў наступным складзе: намеснік старшыні гарвыканкама (старшыня камісіі), начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі гарвыканкама, начальнік упраўлення па адукацыі гарвыканкама, начальнік упраўлення арганізацыйна-кадравай работы гарвыканкама, галоўны рэдактар унітарнага камунальнага выдавецкага прадпрыемства «Рэдакцыя газеты «Бабруйскае жыццё».

6. Дакументы для прысуджэння спецыяльнай прэміі рыхтуе для разгляду на пасяджэнні гарвыканкама аддзел ідэалагічнай работы і па справах моладзі гарвыканкама і, пасля прысуджэння спецыяльнай прэміі, перадаюцца ў гарадскі інфармацыйна-ідэалагічны цэнтр установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

7. Асобе, якой прысуджана спецыальная прэмія, ва ўрачыстых абставінах уручаецца дыплом у рамцы і аднаразовае грашовае ўзнагароджанне ў памеры дзесяці базавых велічынь, устаноўленых на момант прыняцця рашэння.».

2. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

| | |
|---|---|
| **Старшыня** | **А.В.Студнеў** |
| **Кіраўнік спраў** | **Л.С.Пагуда** |